**К. В. Часнакова**

# ТЭОРЫЯ АРХЕТЫПАЎ НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ БЕЛАРУСКАЙ І ІТАЛЬЯНСКАЙ ЛІТАРАТУР ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТАГОДДЗЯ

У розныя часы ў літаратуразнаўстве пераважалі розныя прынцыпы і падыходы да вывучэння прыгожага пісьменства. Даследаванні праводзіліся з пазіцый класічнай філасофіі, этыкі і эстэтыкі, гісторыі, сацыялогіі, ідэалогіі і псіхалогіі, з мэтай выяўлення адметнасцей творчых індывідуальнасцей і не толькі. Адзін з напрамкаў – тэорыя архетыпаў – ініцыяваў актыўную дзейнасць па даследаванні псіхалогіі мастацтва і тых заканамернасцяў, што палягаюць у працэсе стварэння вобразаў, а таксама спрыяў далейшаму развіццю інтэрпрэтацыі літаратурных твораў з пазіцый псіхалогіі і ментальнага складніка.

Даследаванняў, накіраваных на выяўленне архетыповых вобразаў і сюжэтаў у беларускім літаратуразнаўстве няшмат. І ўжо зусім адсутнічаюць работы, якія грунтаваліся б на кампаратыўным аналізе архетыповага складніка менавіта беларускіх і італьянскіх мастацкіх твораў, розных па менталітэце пісьменнікаў, чыя творчасць развівалася ў межах розных сацыяльна-палітычных умоў і неаднолькавых магчымасцяў для самарэалізацыі. Таму надзвычай важна раскрыць вытокі стварэння мастацкіх вобразаў і літаратурных тэкстаў у такіх далёкіх літаратурных традыцыях, прасачыць, як у творчасці пісьменнікаў беларускай і італьянскай літаратур праяўляецца спецыфічна-нацыянальнае і агульнае, універсальнае.

З выкарыстаннем архетыпаў ствараецца “новая міфалогія”, якая заключае ў сабе выразны і прагматычны вобразатворчы патэнцыял. Тое, што міфы і фальклор розных культур маюць агульныя рысы, цікавіла і цікавіць шмат каго з вучоных. Даследаванню архетыпаў і архетыповых вобразаў у літаратуры прысвечаны працы многіх замежных навукоўцаў, тады як у айчынным літаратуразнаўстве гэтай тэматыцы доўгі час не надавалася належнай увагі. Пасля распрацоўкі К. Г. Юнгам уласнай тэорыі архетыпаў (і іх класіфікацыі), шматлікія з яго ідэй выкарыстоўвалі ў сваёй творчасці такія вядомыя пісьменнікі, як Г. Гесэ, Дж. Джойс, Т. Ман і інш. У італьянскім літаратуразнаўстве да тэмы архетыпаў у сваёй дзейнасці звярталіся Д. Капальдзі і Дж. Рагонэ (D. Capaldi, G. Ragone, 2016), Я. Марыяні (J. Mariani, 2014), Д. Руса (D. Russo, 2017), М. Цібальдзі (M. Tibaldi, 2017), аднак нават на

дадзены момант усё яшчэ няма значных даследаванняў па гэтай праблеме, італьянскія літаратуразнаўцы і крытыкі карыстаюцца напрацоўкамі еўрапейскіх, амерыканскіх і нават савецкіх вучоных. З работ псіхолагаў, якія займаліся літаратуразнаўчай практыкай, асабліва варта адзначыць даследаванні Л. С. Выгоцкага (Л. С. Выготский, 1987), К. Наранхо (К. Наранхо, 1997), Д. Шарпа (Д. Шарп, 1994) і інш.

Не толькі пісьменнікі і псіхолагі выкарыстоўвалі і развівалі ідэі архетыповага несвядомага, але і тэарэтыкі мастацтва і літаратуры, у прыватнасці, М. Бодкін (M. Bodkin, 1963), Дж. Кэмпбэл (Д. Кэмпбелл, 2009), Е. М. Меляцінскі (Е. М. Мелетинский, 1976, 1982, 1984), Н. Фрай (Н. Фрай, 1987, 1991) і інш. Тэорыя архетыпаў паспрыяла актыўнаму развіццю дзейнасці ў галіне псіхалогіі мастацтва і тых заканамернасцяў, якія ў творчым працэсе ўплываюць на стварэнне вобразаў. Беларускія даследчыкі пачынаюць звяртацца да аналізу вытокаў мастацкай творчасці і даследаваць праблему архетыпаў у літаратуры прыкладна з пачатку 80-х гг. ХХ ст. На дадзены момант вядомы работы У. В. Гніламедава (У. Гніламёдаў, 1997), В. А. Каваленкі [27; 28], У. М. Конана (У. М. Конан, 1996, 2006), У. І. Мархеля (У. Мархель, 1997), А. М. Ненадаўца (А. М. Ненадавец, 2003), І. А. Чароты (І. А. Чарота, 1995), Т. І. Шамякінай (Т. І. Шамякіна, 2001, 2005, 2008) і інш.

Матэрыялам даследавання абраны творы беларускіх і італьянскіх пісьменнікаў другой паловы ХХ ст., а менавіта аповесць У. Караткевіча “Дзікае паляванне караля Стаха” (У. С. Караткевіч, 2018), раман у вершах Н. Гілевіча “Родныя дзеці” (Н. Гілевіч, 2015), аповесць А. Кажадуба “Русалка” (А. Кажадуб, 2005); раман Ч. Павезэ “Месяц і вогнішчы” (Ч. Павезэ, 1950), аповесць Дж. Т. дзі Лампедузы “Сірэна” (Дж. Т. дзі Лампедуза, 1990), паэма Дз. Буцаці “Паэма ў коміксах” (D. Buzzati, 2017).

Мастацтва робіць магчымым пераход архетыпа са сферы несвядомага ў сферу свядомага і дазваляе дэкадзіраваць яго значэнне. Праблема сапраўднай прыроды мастацтва займала розумы многіх вучоных. Аднак З. Фрэйд і К. Г. Юнг, дзякуючы сваім распрацоўкам па дадзенай тэме, змаглі паўплываць на далейшыя даследаванні ў розных відах мастацтва, у прыватнасці, у літаратуры.

К. Г. Юнг лічыў, што значнай увагі заслугоўвае аналіз вобразаў мастацкага тэксту. У выніку швейцарскі навукоўца стварыў настолькі ўніверсальную класіфікацыю архетыпаў, што нават сёння тыя класіфікацыі, якія былі сфармуляваны вучнямі, паслядоўнікамі К. Г. Юнга, ці значна пазней, з’яўляюцца яе пераасэнсаваннямі і дапаўненнямі. Гэта не абясцэньвае навуковых дасягненняў дадзеных даследчыкаў, тым больш кожная новая школа распрацоўвала іншыя напрамкі, што дазволіла сабраць багаты матэрыял і зрабіць паняцце архетып адным з ключавых у сучасным літаратуразнаўстве. Тлумачэнняў паняцця архетып існуе даволі многа. Намі архетыпы разумеюцца як першасныя, агульныя для ўсіх людзей (незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці) сюжэтныя схемы, вобразы і матывы, што

ўзніклі ў падсвядомасці асобы на ранняй стадыі развіцця чалавецтва, якія найбольш ярка выявіліся ў міфах і фальклоры і захаваліся па сённяшні дзень.

Міфапаэтычны, герменеўтычны, культурна-гістарычны і кампаратыўны аналіз былі выкарыстаны для даследавання абраных літаратурных твораў беларускіх і італьянскіх пісьменнікаў другой паловы XX ст., што дазволіла параўнаць творчыя метады аўтараў, жанравую прыналежнасць тэкстаў, а таксама архетыповую аснову іх вобразаў і сюжэтаў. Архетыповая аснова ўтрымлівае глыбокія духоўныя веды аб "вечных" тэмах (сэнс быцця, дабро, зло, каханне, смерць і інш.), што хвалююць чалавецтва ў цэлым і прадстаўнікоў вышэйзгаданых культур у прыватнасці. У выніку высветлілася, што асноўнымі элементамі выбраных для аналізу літаратурных твораў беларускіх і італьянскіх пісьменнікаў сталі такія архетыпы, як Вялікая Маці (К. Г. Юнг), Герой (Дж. Кэмпбэл, К. Пірсан)/Дзіця (К. Г. Юнг)/Ваяр (К. Пірсан, Р. Мур), Правадыр (ці Настаўнік, па класіфікацыі Дж. Кэмпбэла)/Мудрэц (К. Пірсан)/Дух (К. Г. Юнг), Каханак (ці той, хто здольны кахаць, згодна з класіфікацыямі К. Пірсан і Р. Мура) і Падарожжа (ці Вандраванне (Дж. Кэмпбэл, Н. Фрай)).

К. Г. Юнг лічыў, што архетып распаўсюджваецца праз мову і традыцыі, ён узнікае самаадвольна, незалежна ад месца ці часу, але ўсё ж у народаў і эпох ёсць характэрная для іх накіраванасць ці жыццёвая ўстаноўка, праз якую можна зразумець глыбінныя асновы нацыянальнага мастацтва ў пэўны гістарычны перыяд. Даследчык адзначаў, што каб знайсці так званую праоснову правобраза, патрэбна рэканструкцыя ад твора да яго вытокаў. Тэорыя архетыпаў і абраныя для дадзенага даследавання класіфікацыі (Дж. Кэмпбэла, Р. Мура, К. Пірсан і К. Г. Юнга) дазволілі ажыццявіць комплексны аналіз абраных мастацкіх літаратурных тэкстаў беларускіх і італьянскіх пісьменнікаў другой паловы XX ст., разгледзець характары, вобразы і сюжэты з розных бакоў такім чынам, каб вызваліць іх ад уплыву культурных, нацыянальных, часавых і іншых установак і адшукаць сапраўднае "архетыповае ядро" і зразумець яго зместавую сутнасць.

Архетып Падарожжа становіцца адным з цэнтральных (выявіўся ва ўсіх даследаваных творах: "Дзікае паляванне караля Стаха" У. Караткевіча, "Родныя дзеці" Н. Гілевіча, "Русалка" А. Кажадуба, "Месяц і вогнішчы" Ч. Павезэ, "Паэма ў коміксах" Дз. Буцаці, "Сірэна" Дж. Т. дзі Лампедузы), паколькі з'яўляецца літаратурнай аб'ектывацыяй самаідэнтыфікацыі асобы (пошук сябе, шлях да Самасці).

Праведзены супастаўляльны аналіз паказвае, што ўзнятыя беларускімі і італьяскімі аўтарамі тэмы (адвечнае супрацьстаянне жыцця і смерці, страх, спакуса, надзея, адзінота, марнасць быцця, адрыў ад традыцый, здрада, адносіны паміж новым і старым пакаленнем, апазіцыя горад-вёска, стаўленне да родных мясцін, спажывецкае стаўленне да жыцця, тэма мастака і творчасці, тэма пошуку свайго прызначэння, тэма вайны, заняпад арыстакратычнага роду і інш.), іх героі і сюжэты на глыбінным узроўні з'яўляюцца вельмі блізкімі і падобнымі. Адзінае адрозненне – гэта непасрэдная форма ўва-

сабленне архетыпа і нярэдка процілеглыя канатацыі, што тлумачыцца ўплывам культурных традыцый і пэўнага асяроддзя. Падрабязны, дэталёвы разбор твораў на прадмет наяўнасці ў іх архетыповых вобразаў і сюжэтаў і, як вынік, выяўленне практычна аднолькавага “архетыповага ядра” з’яўляецца яшчэ адным доказам наяўнасці ў псіхіцы людзей таго, што аб’ядноўвае ўсіх чалавечых індывідаў, таго, што ўплывае на лад мыслення і робіць яго падобным у розных людзей і таго, што К. Г. Юнг назваў “калектыўнам несвядомым”.

Даследаваны тэкставы матэрыял дае падставы сцвярджаць, што архетыпы атрымліваюць шматпланавае, комплекснае ўвасабленне на старонках твораў беларускіх і італьянскіх пісьменнікаў. Увогуле, большасць мастацкіх літаратурных тэкстаў мае архетыповую аснову. Архетыпы, ці першавобразы, аб’ядноўваюць усіх людзей незалежна ад сацыяльнай і нацыянальнай прыналежнасці і спрыяюць больш глыбокаму разуменню твора любога віда мастацтва, у дадзеным выпадку – літаратурнага.